# ПЕРШЫЯ КРОКІ СТАНАЎЛЕННЯ ГЕАГРАФІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў МАГІЛЁЎСКІМ ПЕДІНСТЫТУЦЕ

**А.Р.Агееў (Магілёў, МДУ імя А.А. Куляшова)**

У 1913г. у Магілёве пачаў дзейнічаць настаўніцкі інстытут, які ў 1918г. быў пераўтвораны ў педагагічны і ад якога вядзе свой радавод Магілёўскі дзяржаўны універсітэт. Геаграфія адразу заняла прыстойнае месца ў вучэбнай праграме гэтай сярэдняй па свайму статусу навучальнай установы. Дарэчы, пры паступленні абітурыенты здавалі вусны іспыт па геаграфіі і па прыродазнаўству, як і яшчэ па сямі прадметах, і пісалі тры пісьмовыя работы [11, арк.11; 12 арк.2, 2 аб.]. Паступаўшыя павінны былі паказаць веды: геаграфічных карт усіх частак свету і Расійскай імперыі; геаграфіі Расійскай імперыі ў межах падручніка Баранава і Гарэлава; асноўных паняццяў фізічнай геаграфіі, геаграфіі чатырох частак свету (Азіі, Афрыкі, Амерыкі і Аўстраліі) і асобна Еўропы ў межах падручніка Іванова "Пачатковы курс геаграфіі" часткі I, II, III [11, арк.51].

Педагагічны савет інстытута 27 верасня 1913г. ў адпаведнасці з палажэннем аб настаўніцкіх інстытутах і праграмах Маскоўскага і Віцебскага настаўніцкіх і Віленскага хрысціянскага інстытутаў зацвердзіў "прынцыпы і правілы" выкладання прадметаў. Геаграфію прадугледжавалася выкладаць на першым годзе навучання па праграмах выпрацаваных у Віцебскім настаўніцкім інстытуце. Планавалася вывучаць фізічную геаграфію па падручніку "Курс фізічнай геаграфіі" Лестгафта, які быў дапушчаны Вучоным камітэтам Міністэрства народнай асветы для VIII класаў жаночых гімназій і настаўніцкіх інстытутаў [12, арк.2, 12-15].

Рэвалюцыя 1917 г. прывяла да велізарных сацыяльных пераўтварэнняў у грамадстве. Рэфармаванне не абыйшло і сферу адукацыі. Магілёўскі настаўніцкі інстытут, у адпаведнасці з пастановай Усерасійскага з'езду

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

работнікаў настаўніцкіх інстытутаў напрыканцы 1918г., быў пераўтвораны ў педагагічны – вышэйшую навучальную ўстанову з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Інстытут меў 3 аддзяленні і рыхтаваў настаўнікаў школ першай і другой ступені, а таксама работнікаў дашкольных устаноў. Настаўнікаў для школ другой ступені вучылі на розных цыклах. Доўгі час лічылася, што ў Магілёўскім педінстытуце іх было чатыры: фізіка-матэматычны, сацыяльна-гістарычны, біялагічны і літаратурна-мастацкі [1, с. 8-9]. Гэтыя дадзеныя В.А. Бандарэнкі разыходзяцца з дакументамі знойдзенымі намі ў Гомельскім дзяржаўным архіве. Адпаведна ім існаваў і пяты – геаграфічны цыкл [7, арк9; 10, арк.6].

На ўсіх цыклах меліся агульныя прадметы: псіхалогія, логіка, гісторыя навуковага светапогляду, агульная тэорыя эвалюцыі, гісторыя культуры, педагогіка, гігіена, школазнаўства і методыка працоўных працэсаў, гісторыя сацыялізму, палітычная эканомія, вучэнне аб праве і дзяржаве ў сувязі з савецкай Канстытуцыяй, педагагічнае рысаванне, адна з новых (англ., фр., або ням.) моў. Біялагічны і геаграфічны цыклы мелі ў сваю чаргу некаторыя агульныя прадметы: агульны курс фізікі, агульны курс хіміі, агульнае землязнаўства, крышталеграфію і мінералогію, агульную біялогію, выраб дапаможнікаў, геалогію з палеанталогіяй, методыку прыродазнаўства. Да спецыяльных прадметаў біялагічнага цыклу адносіліся: хімія арганічная, хімія аналітычная, заалогія, батаніка, анатомія і фізіялогія раслін, анатомія і фізіялогія жывёл, анатомія і фізіялогія чалавека, параўнальная анатомія жывёл з палентапогіяй, практычныя ўрокі па прыродазнаўству. На геаграфічным цыкле меліся наступныя спецпрадметы: апісальная астраномія, пабудова і рысаванне карт, заа- і фітагеаграфія, метэаралогія і кліматалогія, гаспадарчы побыт народаў, краіназнаўства, геаграфія Расіі, методыка геаграфіі, глебазнаўства, антрапалогія і этнаграфія, практычныя ўрокі па геаграфіі [10, арк 10-12 аб].

У наступным, 1919, годзе было прынята рашэнне аб чарговай рэарганізацыі: педагагічныя інстытуты пераўтвараліся ў інстытуты народнай адукацыі (ІНА) з аддзеламі: 1) дашкольным, 2) па падрыхтоўцы выкладчыкаў для школ І ступені, 3) па падрыхтоўцы выкладчыкаў для школ ІІ-й ступені, 4) пазашкольным, 5) па падрыхтоўцы інструктараў працоўных працэсаў. У адпаведнасці са статутам ІНА адносіліся да вышэйшых навучальных устаноў [6, арк 11-12 ]. Усяго на Беларусі на базе педагагічных інстытутаў былі створаны тры інстытуты народнай адукацыі: Віцебскі, Магілёўскі і Мінскі.

У кастрычніку 1919 г. Магілёўскі ІНА быў адкрыты з чатырма аддзеламі (без пазашкольнага). Аддзелы: дашкольны, па падрыхтоўцы выкладчыкаў для школ І-й ступені, інструктароў працоўных працэсаў – яшчэ знаходзіліся ў працэсе станаўлення. Большасць паступаючых імкнулася на трэці аддзел, які рыхтаваў выкладчыкаў для школ ІІ-й ступені. Ён складаўся з сацыяльна-гістарычнага, прыродазнаўча-навуковага, фізіка-хімічнага, фізіка-матэма-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тычнага (з верасня 1920г. – матэматычнага) цыклаў [7, арк. 9, 9Аб, 26, 45]. Як бачна біялагічны і геаграфічны цыклы аб'ядноўваліся ў адзіны прыродазнаўча - навуковы.

У інстытут слухачоў спачатку прымалі без усялякага адбору. Гэта рабілася ў адпаведнасці з дэкрэтам СНК РСФСР ад 2 жніўня 1918 г. "Аб правілах прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы РСФСР", у якім забаранялася «патрабаваць ад паступаючых якія-небудзь пасведчанні, за выключэннем пасведчання аб іх асобе і ўзросце». Меркавалася, што адсеў будзе адбывацца натуральным шляхам у працэсе вучобы. Гэтым жа дэкрэтам адмянялася плата за навучанне ў ВНУ [4, с.403].

Склад студэнтаў быў надта неаднародным. Сярод прынятых былі асобы з сярэдняй адукацыяй, але шмат было і тых, хто закончыў пачатковыя вучылішчы, 4-х класныя гарадскія школы, меў хатнюю адукацыю, або ўвогуле не меў пэўнай адукацыі [3, с.83]. Гэта, а таксама тое, што ў 1919-1920 навучальным годзе часта адсутнічала святло, паліва, не хапала прэпаратаў у лабараторыях, стварыла, на думку старшыні Савета магілёўскага ІНА Я.В. Бычкова "хвалю адтоку сярод навучэнцаў". Ужо ў 1920-1921 навучальным годзе Савет пастанавіў прымаць слухачоў або з сярэдняй адукацыяй, або педагогаў з пяцігадовым стажам, або па калёквіуму, які прадугледжваў высвятленне развіцця абітурыента па ўсіх прадметах. Калёквіумы праводзіліся ў прысутнасці прадстаўнікоў ад студэнтаў, а 6-й гадзіне вечара, як і заняткі. У кастрычніку 1920г. у ІНА было залічана 60 курсантаў Магілёўскіх двухгадовых педагагічных курсаў. У снежні Савет інстытута, нягледзячы на адсутнасць сродкаў у смеце на гэты год, прыняў рашэнне аб стварэнні гадзічных падрыхтоўчых курсаў для паляпшэння якасці ведаў паступаючых у ІНА [7, арк. 9, 9Аб, 31, 32, 45, 46, 49, 56, 61]. Такім чынам, ад сістэмы залічэння ўсіх жадаючых інстытут паступова перайшоў да конкурснага адбору будучых студэнтаў. Гэта, а таксама адсеў паступіўшых у 1919-1920 гг., палепшыла якасць слухачоў ІНА.

Большасць абітурыентаў паступала на сацыяльна-гістарычны цыкл 3-га аддзела. Спробы размеркаваць паступаўшых раўнамерна па аддзелах не ўдаліся. З прычыны мізернай колькасці слухачоў прыйшлося ў 1920 г. закрыць аддзел па падрыхтоўцы інструктараў працоўных працэсаў. Тэрмін навучання студэнтаў у ІНА, як і ў педінстытуце, быў чатырохгадовы. Але ўжо 2-га верасня 1920 г. Савет інстытута разгледзіў навучальныя планы аддзелаў, дашкольнага і па падрыхтоўцы выкладчыкаў для школ 1-й ступені, і прыйшоў да высновы, што іх можна выканаць і за тры гады. У выніку абодва аддзелы былі пераведзены на 3-гадовы тэрмін навучання [7, арк. 9Аб, 26, 41, 42, 49].

З мэтай марксісцкага выхавання студэнтаў у ІНА былі ўведзены агульныя прадметы: гісторыя і тэорыя навуковага сацыялізму, савецкая канстытуцыя, палітычная эканомія, вучэнне аб адзінай працоўнай школе.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Але пазначаныя прадметы выкладалі не камуністы, бо з ліку апошніх "не знайшлося жадаючых іх чытаць." У кастрычніку 1920г. Савет абмяркаваў пытанне аб увядзенні ў якасці неабавязковага прадмета "Гісторыі хрысціянства" [7, арк 27, 28, 54 аб]. Толькі з-за адсутнасці вольных памяшканняў яно было адкладзена. У студэнтаў былі калядныя і велікодныя вакацыі. Адначасова з рэвалюцыйнымі яшчэ адзначаліся і рэлігійныя святы.

Улада бальшавікоў Магілёва не спрыяла "беспартыйнай" (партыйная за выключэннем камуністычнай у тыя гады была ўжо немагчыма) культурнай і грамадскай дзейнасці. Тым не менш студэнты ўдзельнічалі ў працы "Саюза навучэнцаў г. Магілёва", куды ўваходзілі вучні гімназій, семінарый, палітэхнічнага інстытута ды некаторых іншых навучальных устаноў. Па вуліцы Нова-Чарнігаўскай (пр-т Пушкінскі), 14 працаваў Цэнтральны клуб навучэнцаў, у якім былі літаратурная, драматычная, мастацкая і спартыўная секцыі, палітгурток. [2].

Студэнты ІНА складалі ядро, актыўна ўдзельнічалі і ў дзейнасці магілёўскага гуртка беларускай моладзі «Асвета», які праводзіў вялікую культурна-асветніцкую работу ў Магілёўскім павеце. Гуртkoўцы заснавалі хор з 80-ці чалавек, драматычную групу з 20 чалавек, якія часта давалі канцэрты як у Магілёве, так і ў навакольных вёсках. «Асвета» з'яўлялася часткай беларускага нацыянальнага руху Гомельскай губерніі, які выступаў за далучэнне беларускіх тэрыторый РСФСР да БССР[2].

Ужо пры ўтварэнні педінстытута ў склад супрацоўнікаў увайшлі лепшыя выкладчыкі навучальных устаноў Магілёва, запрошаны з Маскоўскай Пятроўска - Разумоўскай Акадэміі С.В.Галынскі, доктар філасофіі, публіцыст, аўтар шэрагу палітыка - эканамічных даследаванняў С.В. Марголін і іншыя. Усяго ў штаце магілёўскага ІНА згодна са спісам выкладчыкаў і служачых на пачатак 1921 г. было 58 супрацоўнікаў, сярод іх 36 выкладчыкаў, з якіх 31 меў вышэйшую адукацыю або прыроўненую да яе. Найбольш працавала выпускнікоў Петраградскага (7), Маскоўскага (4) універсітэтаў, а ўсяго універсітэтскую адукацыю мела 15 выкладчыкаў. Працавалі таксама выпускнікі Дзямідаўскага ліцэя (2), Педагагічнага інстытута імя Шалапуціна, Акадэміі генеральнага штаба, Рыжскага палітэхнічнага інстытута, Петраградскага гісторыка-філалагічнага інстытута ды інш. Выкладчык малявання і лепкі Ф.Р. Пархоменка акончыў Акадэмію мастацтваў у Петраградзе, а выкладчык спеваў і музыкі А.І. Бекарэвіч – прыдворную пеўчую капэлу. У ІНА выкладалі доктар навук С.В. Марголін, кандыдат эканамічных навук М.В. Юдзеніч, кандыдаты багаслоўя В.М. Тычынін і В.П. Сакалоў (навуковыя ступені двух апошніх ужо не адзначаліся ў анкетах і даведках) [7, арк. 22-23]. У інстытуце працаваў такі вядомы беларускі гісторык, архівіст і археограф, як Д.І. Даўгяла. З 1915 года ён пражываў у г. Магілёве і працаваў у архіве.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзмітрый Іванавіч далучыўся да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, удзельнічаў ва Усебеларускім кангрэсе 1917г. [1, с11;2, с.35].

Матэрыяльнае становішча супрацоўнікаў было вельмі цяжкім. Як і ў іншых установах частку платы за працу выдавалі пайком, частку – грашыма. Практычна ўсе выкладчыкі падпрацоўвалі ў іншых навучальны ці савецкіх установах, у тым ліку ў тэхнікумах, лекторыях, на курсах і г. д. [8, арк.14-16, 18]. Большасць выкладчыкаў была мабілізавана і на працу ў асветніцкія ўстановы Чырвонай Арміі, напрыклад, у чырвонаармейскі універсітэт 16-й арміі (пралетарскія, сялянскія, чырвонаармейскія народныя універсітэты, якія ствараліся ў 1918-1920г.г. на хвалі рэвалюцыйнага энтузіязму, фактычна былі культурна-асветніцкімі, а не вышэйшымі навучальнымі ўстановамі – заўв.аўт.). Рэктар чырвонаармейскага універсітэта 16-й арміі Н. Кібоўскі ў знак удзячнасці даслаў у ІНА поштатэлеграму, у якой вітаў лектараў і слухачоў інстытута з «двухгадовым існаваннем» і жадаў плённай працы на ніве культурнай дзейнасці сярод працоўнага народа Савецкай Расіі» [7, арк.53,63]. Гаворачы аб матэрыяльным становішчы супрацоўнікаў інстытута, трэба ўлічваць і наступствы рэквізіцый 1919–1920гг., і кампанію збора сродкаў галадаючым Паволжжа.

Важнай задачай таго часу было захаванне і развіццё матэрыяльнай базы інстытута. Кіраўніцтва педінстытута ў 1919 г. прыняла абгрунтаваную, але відавочна не разлічаную на ўмовы грамадзянскай вайны праграму яе развіцця. У ліку іншага прадугледжавалася стварыць геаграфічны і мінеролага - геалагічны кабінеты, хімічную, батанічную, заалагічную і фізіялагічную лабараторыі, метэаралагічную станцыю [10, арк.4-38]. Нерэалістычнасць планаў выявіў першы жа год існавання педінстытута. Праграма была практычна сарвана. "У клопатах аб стварэнні нармальных умоў для вучэбных заняткаў Савет інстытута ўвесь час змагаўся з велізарнымі, часта непераадольнымі перашкодамі". Тым не менш у 1919г. было абвешчана аб адкрыцці дзвюх хімічных лабараторый, мінералагічнага кабінета [10, арк. 37 аб]. У 1920–1921 гг. існавалі, на думку кіраўніцтва, неблага абсталяваныя лабараторыі неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, кабінеты фізічны (тыпу кабінетаў сярэдняй школы без фізічнай лабараторыі), батанікі, заалогіі (хутка абсталяваны і выдатна аформлены дзякуючы намаганням прэпаратара В. І Мерцалава), псіхалогіі. На кабінеты гісторыі і рускай мовы, у якіх спецыяльныя прадметы ў першыя гады існавання ІНА не чыталіся, "мала звярталася ўвагі". Пры інстытуце дзейнічалі пераплётная і дрэваапрацоўчая майстэрні. Да таго ж ІНА карыстаўся ліцейнай і механічнай майстэрнямі педагагічнага тэхнікума. Напрыканцы 1920 г. у сувязі з заявай М. В. Юдзеніча аб неабходнасці стварэння пры ІНА музея першабытнай культуры Савет інстытута рашае стварыць спецыяльную камісію па вывучэнню гэтага пытання. У гэты ж дзень – 21снежня 1920 г. Савет прымае рашэнне аб



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

неабходнасці выдання свайго друкаванага органа ў выглядзе бюлетэня і прасіць паперу на гэтую справу" [7, арк. 9Аб, 63Аб, 64Аб].

Кіраўніцтва ІНА у 1920г. вырашыла ўтварыць сельскагаспадарчую ферму з мэтай арганізацыі вучэбна - узорнай гаспадаркі, паляпшэння матэрыяльнага становішча Інстытута і выкладчыкаў, у прыватнасці. У Дабрасневічах Княжыцкай воласці Магілёўскага павета было адведзена для фермы 29 дзесяцін зямлі [1с.10].. Але наладзіць гаспадарку не ўдалося, бо мясцовыя сяляне часткова захапілі маёнтак "Дабрасневічы" і аднесліся да перадачы зямлі інстытуту "вельмі варожа", а для апрацоўкі яшчэ не захопленай зямлі не ўдалося знайсці сродкаў. 21 студзеня 1921 г. Савет ІНА зноў абмяркоўвае пытанне аб стварэнні вучэбна - узорнай гаспадаркі цяпер ужо ў в. Красніца Вендрыжскай воласці Магілёўскага павета. Савет хадайнічаў аб выдзяленні 21 дзесяціны перад Магілёўскім зямельным аддзелам. Участак знаходзіўся ў 12 вярстах ад горада ля чыгуначнага пераезда і шашэйнай дарогі. Меліся памяшканні для скота, інвентара, персаналу [7, арк.4,17].

Гаспадарка павінна была садзейнічаць студэнтам у вывучэнні сельскагаспадарчых працоўных працэсаў, знаёміцца з агракультурнымі работамі: паляводствам, садоўніцтвам, лугаводствам і па магчымасці з агародніцтвам. Блізкасць лесу дазваляла ў будучым арганізаваць і лесакультурныя работы. Для практычных работ выдзялялася: 1) вучэбна - узорнае поле (палетак) плошчай 6 дзесяцін, для азнаямлення з плоданасеннем, разнастайнымі культурнымі раслінамі, якія маюць значэнне "для мясцовага краю" і для вывучэння ўплыву розных угнаенняў на развіццё раслін; 2) вучэбна - гаспадарчае поле плошчай 8 дзесяцін, на якім уводзіўся Валакаламскі 8-гадовы севазварот (папар, жыта, канюшына 1-га году, канюшына 2-га году, авёс, папар, жыта, авес); 3) вучэбны агарод плошчай 6 дзесяцін, які з'яўляўся і гаспадарчым з чаргаваннем культур (капуста і бручка па вялікаму гною; кармавыя караняплоды; бульба, сталовыя караняплоды па мінеральных угнаеннях; ячмень або пшаніца; гарох або фасоля); 4) калекцыйны гадавальнік для культурных раслін плошчай 1 дзесяціна. У 1921г. не прадугледжвалася ствараць вучэбна - паказальнае поле, пад якое выдзялялася нядаўняя залеж, якую адразу немагчыма было ўзараць. Савет ІНА ухваліў дзеянні праўлення і выказаў удзячнасць выкладчыку Арлову М.І., які займаўся гэтым пытаннем. Адначасова было прынята рашэнне аб арганізацыі пры ферме біялагічнай станцыі для знаёмства студэнтаў "з прыродай у яе натуральным стане" [7, арк. 17, 17Аб].

На пачатку лютага 1921 г. у Маскву была накіраваны "Каштарыс на абсталяванне вучэбна - узорнай гаспадаркі" на суму 26. 658. 996 руб., у тым ліку на "асабісты склад" гаспадаркі – 782.496 руб. на год. Прадугледжвалася мець загадчыка гаспадаркі з акладам 4.200 руб у месяц (50.400 руб. у год), кіраўніка, садоўніка і агародніка, 3-х рабочых мужчын,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пастуха, скотніка, вартаўніка начнога і 2-х работніц жанчын з акладам па 1.290 руб. у месяц (15.480 руб. у год – найменшыя аклады з усіх работаючых). На «жывы і мёртвы інвентар запрошвалася 9.315 тыс.руб., у тым ліку 2.500 тыс. руб. на 5 коней, 3 млн. руб. на 10 кароў, 60 тыс. руб на 2-х свіней, а таксама на калёсы, плугі, хамуты, акучнікі, бароны, рыдлёўкі, сякеры, сярпы, малатарню з конным прывадам, веялку і інш. На «насенны матэрыял і фураж» прадугледжвалася 16.561.500руб. [7, арк. 8,18-19].

Утварэнне вучэбна - узорнай гаспадаркі і біялагічнай станцыі не ішло лёгка. Фінансаванне фермы затрымоўвалася, а яе штаты не былі зацверджаны, нягледзячы на блізкасць веснавых работ. Праўленне вымушана было сваім рашэннем замясціць шэраг пасад. У спісе супрацоўнікаў ІНА ў красавіку 1921 г. ужо значыцца загадчыкам вучэбна - узорнай фермы Арлова Ларыса Васільеўна, якая ў свой час закончыла вышэйшыя сцебутаўскія сельскагаспадарчыя курсы, старэйшым рабочым фермы – Савук Ян Янавіч, рабочай біялагічнай станцыі – Дрыксна Вольга Хрыстафораўна. 21 сакавіка Савет ІНА зацвердзіў штаты біялагічнай станцыі, а яе загадчыкам абраў Арлова Мікалая Іванавіча, які раней працаваў на біялагічнай станцыі ў Мурмане. 18 красавіка Савет інстытута зацвердзіў створаны праўленнем для кіравання вучэбна - узорнай гаспадаркай спецыяльны сельскагаспадарчы камітэт, у які ўвайшлі члены праўлення, загадчыца фермай, скарбнік інстытута і два прадстаўнікі ад студэнтаў, а Арлову Л.В. абраў загадчыцай фермы аднагалосна [7, с.8, 14, 22–23,28-29].

І гаспадарка, і станцыя пачалі функцыянаваць у красавіку-маі. Інстытут уступіў у карыстанне 25-ю дзесяцінамі зямлі. Мясцовыя ўлады адпускалі насенны матэрыял: авёс, бульбу, ячмень, агароднае насенне і г.д. І абяцалі выдзеліць 3-х коней, якіх, праўда, Л.В. Арловай доўга не ўдавалася з іх "выбіць". Нягледзячы на гэта, часткова агарод удалося ўзараць ужо да 18 красавіка. Па просьбе старшыні Савета інстытута дапамогу ў падрыхтоўцы да работы гаспадаркі аказаў спецыяльны атрад упраўлення ваенна-будаўнічых работ. Губернскія ўлады вырашылі выдзяліць для інстытуцкай фермы з сум на "працоўныя працэсы" 172 млн. руб. (магчыма памылка друку – аўт.). Ужо ў маі ў Красніцах меліся ўмовы для працы студэнтаў: некалькі інтэрнатаў на 5-6 чалавек, кацёл для варкі ежы і г. д. Савет дазволіў і некаторым супрацоўнікам апрацаваць невялікія ўчасткі зямлі "сваёй асабістай працай", бо "недапушчальна, каб зямля не была засеяна". Гэта, відаць, было істотнай матэрыяльнай падтрымкай і бюджэтам супрацоўнікаў інстытута [7, арк. 24-29].

Асабіста працуючы на ферме, у полі, садзе або майстэрні, студэнты паглыблялі і замацоўвалі свае веды па тэарэтычных прадметах. У пастанове Савета ад 23 мая 1921г. гаворыцца, што «кожны студэнт да заканчэння навучальнага года павінен пакінуць, як доказ засваення працоўных працэсаў, вынік сваіх прац» у адной з майстэрняў, або на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ферме. Без выканання нормаў працы студэнты не пераводзіліся на наступны курс. У 1921 г. сельскагаспадарчыя работы былі абавязковымі для студэнтаў трэцяга года навучання [7, арк. 24Аб-29]. Пасля пераўтварэння восенню 1921г. ІНА у ПІНА ферма захавалася, і у справаздачах практычнага інстытута народнай адукацыі яна фігуруе, як саўгас "Красіна" – вучэбная ўзорная гаспадарка. [9, арк.4аб]. Яе прадукцыя ішла як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў, служачых і рабочых інстытута.

У самыя цяжкія і галодныя гады грамадзянскай вайны калектыў інстытута працягваў падрыхтоўку педагагічных кадраў, а яго кіраўніцтва спрабавала захаваць кадры выкладчыкаў і нават развіваць матэрыяльную базу. І ў педінстытуце, і ў інстытуце народнай адукацыі рыхтавалі настаўнікаў геаграфіі і біялогіі. Ў 1921г. была створана вучэбна - узорная сельскагаспадарчая гаспадарка і біялагічная станцыя. Такімі былі першыя крокі станаўлення геаграфічнай адукацыі ў педінстытуце.

**Літаратура:** 1.Бондаренко В.А. Могилевский государственный педагогический институт: Краткий очерк истории (к 60-летию основания). – Мн., 1978. 2.Васілеўскі Ю. Да гісторыі Магілёўскага гуртка беларускай моладзі "Асвета" (1918–1923гг. ) // Магілёўская даўніна. – 1994. – С. 29; 1996. – С. 32. 3.Красовский Н.И. Высшая школа Советской Белоруссии. – Мн., 1972. 4. Народное образование в СССР. Общеобразовательная школа. Сб. документов. 1917–1973гг. – М., 1974. 5.Гомельскі дзяржаўны архіў (ГДА). – ф. 60, воп. 1, спр. 2. 6.Там жа. – спр 969. 7.Там жа. – спр 970. 8.Там жа. – спр. 996. 9.Там жа. – спр 1010. 10.Там жа. – спр. 1811. 11.Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф:2258, вып.1, спр.6. 12.Там жа., спр.22.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова